# V міжрэгіянальная спартакіяда для людзей з абмежаванымі магчымасцямі



23 жніўня 2019 года каманда аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» прыняла ўдзел у V міжрэгіянальнай спартакіядзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў г. Смаргонь. У спаборніцтвах удзельнічалі пяць каманд АДЗІ тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання (Ашмяны, Смаргонь, Астравец, Вілейка, Маладзечна) - 30 чалавек. Нашу каманду прадстаўлялі Аляксандр Гоман, Кацярына Лябёдак, Дзяніс Белогривый, Пётр Матусевіч і група падтрымкі. Праграма спартакіяды складалася з шасці спаборніцкіх відаў: кідкі ў кальцо, пенальці, стральба па мішэнях з аўтамата, дартс, мястэчкі і міні-боўлінг. Па выніку спаборніцтваў у каманды Ашмян два прызавых месцы: першае - у Кацярыны Лябёдак і трэцяе - у Аляксандра Гомана. Акрамя спартыўнай часткі ў гэты дзень усе разам добра правялі час: спявалі, гулялі, танцавалі, абедалі. Дадому вярталіся з новымі ўражаннямі і добрым настроем, з кубкамі, медалямі, прызамі і дыпломамі.









